Сямейная газета



**«Звязда» дапамагла сям'і стаць шматдзетнай**



**Татуіроўка пасля складанай аперацыі**



**Мы не таварышы. І не спадары?**

СТАР. 14

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Вадзім ЗАКРЭЎСКІ, намеснік міністра энергетыкі:**

*«У выніку выканання галіновай праграмы развіцця электраэнергетыкі на 2016—2020 гады плануецца ўвесці ў эксплуатацыю атамную станцыю. Мы разлічваем вывесці да 400 МВт неэфектыўных магутнасцяў і замяніць іх новымі. Плануецца замяшчэнне 2,5 млрд куб. м газу, у тым ліку за кошт уводу АЭС і будаўніцтва энергакрыніц на мясцовых відах паліва. Гэта дазволіць знізіць долю дамінуючага рэсурсу — прыроднага газу — у вытворчасці цеплавой і электраэнергіі да 70%, цяпер яна каля 90%».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9225 | ▲ |
| Еўра | 2,0490 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0323 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0713 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ЛЮТАГА 2017 г. ЧАЦВЕР № 27 (28391)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**СПАДЧЫНА Францыска Скарыны і 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, юбілеі класікаў літаратуры і найноўшыя выданні для дзяцей, даследаванні нашай культуры і практычныя дапаможнікі па стварэнні нацыянальнага касцюма. Вось асноўныя акцэнты аб'яднанага стэнда беларускіх дзяржаўных выдавецтваў. Але калі зірнуць на кніжную выстаўку шырэй, тут можна заўважыць не толькі і не столькі кнігі, колькі жаданне экспанентаў з 31 краіны праз выданні расказаць пра ўласную культуру. Таму часта на стэндах — поруч з кнігамі — мастацкія вырабы, артэфакты, а самі выдаўцы і пісьменнікі — у касцюмах з элементамі традыцыйных строяў свайго народа.**




# Місія кнігі — яднаць

## У сталіцы ўрачыста адкрылася XXIV Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш




Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.




Так, выстаўка ў беларускай сталіцы яшчэ раз паказала: кніга мае здольнасць яднаць літаратуры, культуры, народы не толькі праз прысутнасць у пэўным месцы ў пэўны час, але і праз важныя пагадненні, перамовы, якія становяцца магчымымі дзякуючы форуму. Сёлета ў Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы прымаюць удзел некалькі соцень экспанентаў з 31 краіны. Гэта Беларусь, Азербайджан, Венесуэла, Вялікабрытанія, Германія, Грэцыя, Ізраіль, Іран, Італія, Казахстан, Рэспубліка Карэя, Кітай, Куба, Малдова, Пакістан, Палесціна, Польшча, Расія, Сербія, Сірыя, Славакія, ЗША, Таджыкістан, Туркменістан, Турцыя, Украіна, Фінляндыя, Чэхія, Швейцарыя, Швецыя, Эквадор. Ганаровым госцем выстаўкі стала Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі.

Традыцыйна мінскі кніжны форум прыцягвае ўвагу шырокай грамадскасці, а ва ўрачыстай цырымоніі яго адкрыцця прымаюць удзел прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, пісьменнікі, выдаўцы.

СТАР. 4

■ Справа грамадства

# ДРЭВА ЯК КРЫНІЦА ПРЫБЫТКУ,

## або Навошта патрэбна чорна-зялёная карта?

**Наяўнасць інфармацыі пра эканамічную выгаду ад зялёных зон можа дапамагчы гараджанам пры абмеркаванні планаў забудовы Мінска, упэўнены актывісты грамадскай кампаніі «Гарадскі Ляснічы». Для гэтых мэт яны стварылі так званую чорна-зялёную карту, на якой першым колерам пазначаны прамысловыя зоны, закінутыя прадпрыемствы і пусткі, а другім — паркі і скверы. Для апошніх падлічана тая самая эканамічная выгада, якую яны прыносяць сталіцы і яе жыхарам. Так, напрыклад, зялёны ўчастак памерам 12 гектараў можа захоўваць у гарадскім бюджэце да 240 тысяч рублёў у год. І гэта без уліку грошай, сэканомленых на медыцынскіх паслугах, якія спатрэбяцца жыхарам, што пражываюць у раёнах з дрэннай экалогіяй.**

Чорна-зялёная карта ўжо даступная ў інтэрнэце па адрасе map.urbanforester.by. Праўда, пакуль што на ёй пазначаны звесткі толькі па адным раёне — Ленінскім. Актывісты «Гарадскога Ляснічага» правялі карпатлівую працу па зборы інфармацыі з усіх зялёных зон адміністрацыйнай адзінкі, а для некаторых з іх падлічылі кошт экасістэмных паслуг, якія яны даюць гораду. Гэтак жа падлічаны прыбыткі (ці страты) прадпрыемстваў, што знаходзяцца ў «чорных» зонах.

СТАР. 3